а таксама прамым начальнікам, якія маюць не меншую, чым у яго, дысцыплінарную ўладу.

Камандзір (начальнік) мае права зняць дысцыплінарнае спагнанне толькі пасля таго, як яно адыграла сваю выхаваўчую ролю. Адначасова з ваеннаслужачага можа быць знята толькі адно дысцыплінарнае спагнанне.

Заахвочванні аб'яўляюцца перад строем, на нарадзе ваеннаслужачых, у загадзе або асабіста. Аб'яўленне загадаў аб заахвочваннях, а таксама ўручэнне ўзнагарод ваеннаслужачым, якія адзначыліся, праводзіцца ва ўрачыстай абстаноўцы. Адначасова з аб'яўленнем загадаў аб заахвочваннях ваеннаслужачым уручаюцца граматы, каштоўныя падарункі або грошы, асабістыя фатаграфіі ваеннаслужачых, знятых пры разгорнутым Баявым Сцягу воінскай часці, а таксама зачытваюцца тэксты паведамленняў бацькам (асобам, на выхаванні якіх знаходзіўся ваеннаслужачы) ці па месцы ранейшай працы (вучобы, жыхарства) аб узорным выкананні воінскага абавязку і атрыманых заахвочваннях.

**Дысцыплінарная адказнасць ваеннаслужачых.** Усе ваеннаслужачыя незалежна ад воінскага звання і пасады роўныя перад законам і нясуць адказнасць, устаноўленую для грамадзян Рэспублікі Беларусь, з улікам асаблівасцей праходжання ваеннай службы.

Дысцыплінарную адказнасць ваеннаслужачыя нясуць за парушэнні воінскай дысцыпліны ў парадку, устаноўленым **Дысцыплінарным статутам** Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Пры парушэнні ваеннаслужачым воінскай дысцыпліны, неналежным выкананні абавязкаў ваеннай службы камандзір (начальнік) абавязаны нагадаць яму пра яго абавязкі і воінскі доўг, указаць на дапушчаныя парушэнні і недахопы, а пры неабходнасці прымяніць дысцыплінарнае спагнанне.

Дысцыплінарнае спагнанне як мера выхавання і ўмацавання дысцыпліны ваеннаслужачых павінна адпавядаць цяжару здзейсненай правіннасці і ступені віны.

На салдат могуць накладацца дысцыплінарныя спагнанні (мал. 89).

На сяржантаў дадаткова могуць накладацца наступныя дысцыплінарныя спагнанні: паніжэнне ў воінскай пасадзе; паніжэнне ў воінскім званні; паніжэнне ў воінскім званні да звання «радавы» з пераводам на ніжэйшую пасаду.

Пры вызначэнні віду і меры дысцыплінарнага спагнання прымаюцца пад увагу характар правіннасці, акалічнасці яе здзяйснення

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

і наступствы, ранейшыя паводзіны вінаватага, а таксама час яго знаходжання на ваеннай службе.

Ступень строгасці дысцыплінарнага спагнання ўзрастае, калі правіннасць здзейснена ў час нясення баявога дзяжурства або пры выкананні іншых абавязкаў ваеннай службы, у стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап’янення, а таксама калі вінаваты раней неаднойчы здзяйсняў правіннасці.

Дысцыплінарнае спагнанне ў выглядзе змяншэння працягласці адпачынку за ўвесь перыяд ваеннай службы можа накладацца на ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы за: знаходжанне па месцы ваеннай службы або ў грамадскіх месцах у стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап’янення; самавольнае пакіданне воінскай часці або месца ваеннай службы; няяўку да месца ваеннай службы ў тэрмін без уважлівых прычын пры звальненні з распалажэння воінскай часці, прызначэнні на воінскую пасаду або пераводзе ў іншую воінскую часць, з камандзіроўкі, адпачынку ці арганізацыі аховы здароўя.

Таксама падставай для змяншэння працягласці адпачынку можа служыць: парушэнне статутных правілаў узаемаадносін паміж

ДЫСЦЫПЛІНАРНЫЯ СПАГНАННІ, ШТО НАКЛАДАЮЦЦА НА САЛДАТ

- вымова
- строгая вымова
- пазбаўленне салдат тэрміновай ваеннай службы права на звальненне з размяшчэння воінскай часці на тэрмін да аднаго месяца
- прызначэнне салдат тэрміновай ваеннай службы да пазачарговага нарада па службе, за выключэннем прызначэння ў каравул і на баявое дзяжурства, — да пяці нарадаў
- змяншэнне працягласці адпачынку за ўвесь перыяд ваеннай службы
- арышт з утрыманнем на гаўптвахце на тэрмін да дзесяці сутак
- паніжэнне ў воінскім званні «яфрэйтар»

Мал. 89. Дысцыплінарныя спагнанні, што накладаюцца на салдат

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки

ваеннаслужачымі; парушэнне правілаў нясення баявога дзяжурства; парушэнне правілаў нясення каравульнай службы; парушэнне правілаў нясення ўнутранай службы; парушэнне правілаў патрулявання; парушэнне правілаў нясення пагранічнай службы; наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі ці іншай ваеннай маёмасці.

Ваеннаслужачы, на якога накладзена дысцыплінарнае спагнанне, не вызваляецца ад матэрыяльнай адказнасці за нанесены ўрон.

Дысцыплінарнае спагнанне прыводзіцца ў выкананне, як правіла, адразу, а ў выключных выпадках — не пазней за адзін месяц з дня яго накладання. Па заканчэнні месячнага тэрміну дадзенае дысцыплінарнае спагнанне ў выкананне не прыводзіцца, але заносіцца ў службовую картку. У такім выпадку асоба, па віне якой яно не было прыведзена ў выкананне, нясе дысцыплінарную адказнасць.

Аб накладзеных дысцыплінарных спагнаннях аб'яўляецца:

- салдатам — асабіста або перад строем;
- сяржантам — асабіста, на нарадзе або перад строем сяржантаў, афіцэраў і прапаршчыкаў.

1. Што такое воінская дысцыпліна?
2. Чым падтрымліваецца воінская дысцыпліна?
3. Назавіце віды заахвочванняў, якія прымяняюцца да салдат і сяржантаў.
4. Якія дысцыплінарныя спагнанні могуць накладацца на салдат?
5. Ад чаго залежыць строгасць спагнання, якое накладаецца?
6. Ваеннаслужачы А. сваёй правіннасцю нанёс матэрыяльны ўрон. Ён атрымаў дысцыплінарнае спагнанне і быў упэўнены, што гэтым усё абмяжуецца. Ці так гэта?

## § 22. Сутачны нарад роты. Прызначэнне, састаў, узбраенне сутачнага нарада. Абавязкі днявальнага па роце

*Які агульнавоінскі статут вызначае правілы ўнутранага парадку ў воінскіх часцях?*

**Сутачны нарад роты.** Сутачны нарад па роце прызначаецца для падтрымання ўнутранага парадку, аховы асабовага саставу, узбраення, ваеннай тэхнікі і боепрыпасаў, памяшканняў і матэрыяльных сродкаў

Правообладатель Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки